*ЭКСПРЕСС-ПОРТРЕТ

# Пятро Прыходзька

Член Союза писателей СССР с 1947 года. Член КПСС с 1942 года. Участник Великой Отечественной войны, которую прошел от начала до конца, от Волги до Праги. Был дважды ранен. Подполковник в отставке. Награжден двумя орденами Красной Звезды, орденами Отечественной войны первой и второй степени, медалями «За боевые заслуги», «За доблестный труд» и другими.

Первые стихи были опубликованы еще до войны, в 1937 году в газетах «Чырвоная змена» и «Камунар Магілёўшчыны». После войны в издательствах Белоруссии и Москвы вышло в свет более тридцати книг поэзии.

Сейчас в издательстве «Мастацкая літаратура» подписана к печати книга публицистической прозы «Па слядах маланкі», основу которой составляет фронтовой дневник поэта.

## Споведзь старога байца

Я ганаруся простым званнем
Айчыннай гвардыі байца,
І не магу з расчараваннем
Чакаць свайго жыцця канца.
Здаецца мне — у сэрцы
з болем
Нібыта ў пекла трапіў зноў:
Зямлю хтось робіць бітвы
полем,
Дзе для баёў няма асноў...
На плошчах мне крычаць
заўзята,
Што я — застойных дзён
пясняр.
Мяне — старога ўжо салдата —
Гатоў ударыць хтосьці ў твар
Ды ўсім вядома, нат малому
Дзіцятку на маіх руках:
Непадуладны духу злому
Прайшоў па ўсіх я бальшаках —
І там, дзе градам білі кулі,

## Ёсць і мая віна...

Курыла пылам дальняя
дарога, —
Не ўсе па ёй вярталіся з
вайны.
Я не пытаў тады ў сябе самога,
Ці ёсць хоць частка і маёй
віны
Ў тым, што знікалі мы ў вірах
шалёных,
Што за чатыры доўгія гады
Параненых, забітых і палонных
Згубілі мы мільёны назаўжды?..
Не меў тады высокага я
звання —
Палітбайцом пратупаў па вайне.
Сабе ж такое задаваць пытанне
Падказвае само сумленне мне.

Сапёркай ля дарогі узарана
Была амаль уся зямля мая.
Дарогай той была спавіта рана,

І там, дзе ціха дождж імжыць.
Хоць мне кукуючы зязюлі
Не наракалі доўга жыць.
А я жыву, а я працую,
Пакуль пульсуе ў жылах кроў.
За што ж на мітынгах бічуюць
Мяне, радню, маіх сяброў?
І сам я культы асуджаю
За кроў, за смерць, за жах вайны.
Перад Радзімаю не маю
Сваёй ніякае віны.
Ці ж не хачу я дружбы, зладу
З усёю роднай старанай?
Мне там не месца, дзе за ўладу
Хтось б'ецца крыўдай і маной.
Не буду брацца зноў за зброю,
Бо здаў яе даўно ў музей.
І пра адно я толькі мрою,
Каб перажыць сумбур падзей.
Каб узрасталі дзеці, ўнукі
І не на дзедаўскіх касцях,
Узяўшы цвёрда дрэўкі ў рукі,
Няслі адзінай волі сцяг!

З якой на ногі ўстаць не змог бы я.
Свой хтосьці — малдаванін ці літовец —
Мне дапамог узняцца з-пад зямлі.
Я пазнаваў яго па роднай мове,
Хоць з рэгіёнаў розных мы былі...

Сягоння зноўку здесь пад Кішынёвам
Яго шалёны вецер абдае.
Я працягнуць яму руку гатовы —
Зрабіць жа гэта нехта не дае...
Між намі ўзнікла нейкая навала,
Якая мне самому ледзь відна.
Што сёння роспач нас апанавала —
Напэўна, ў тым ёсць і мая віна?..

**Пятро Прыходзька : экспресс-портрет** // Советская Белоруссия. — 1991. — 22 июня